**Сяргей Зелянко**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# ІНТЭРТЭКСТУАЛЬНАСЦЬ ЯК ПАЗНАКА НОВАЙ МАНЕРЫ ЖУРНАЛІСЦКАГА ПІСЬМА

Агульны плюралізм, рызаматычнасць і глабальная шматвектарнасць, якія пануюць у сітуацыі постсучаснасці, дазваляюць вылучаць і характарызаваць толькі пэўныя рысы, некаторыя асаблівасці і канцэптуальныя

аспекты творчых паводзін аўтараў у эпоху постмадэрну, на якіх грунтуецца так званая постмадэрнісцкая манера пісьма. Сярод іх вылучаюцца: "двайное кадзіраванне" (аўтарская гульня з некалькімі рознымі сэнсамі, з якіх самы не падрыхтаваны рэцыпіент інфармацыі счытвае толькі "верхні", самы відавочны і дасціпны пласт); пераадольванне розных межаў і ўмоўнасцяў, як жанрава-стылёвых, так і светапоглядна-канцэптуальных (найперш, пераадольванне мадэрнісцкай дуальнасці "добра – дрэнна", "правільна – няправільна", а значыць, – і спроба выхаду за межы бінарнай логікі); іронія (прытворства) як высмейванне рэальнасці, заснаванае на сумненні ў яе сапраўднасці, нават на ўпэўненасці ў яе несапраўднасці, ці выпрабаванне гэтай рэальнасці на трываласць для вызначэння магчымасці альбо немагчымасці яе існавання (як адзін з сродкаў дыстанцыравання ад рэчаіснасці); інтэртэкстуальнасць (ва ўсіх праявах, у выглядзе імпліцытнай і эксплiцытнай рэмінісцэнцый, уласна цытаты і трансфармаванай яе формы, тапанімічнай, хрананімічнай, сітуацыйнай і антрапанімічнай алюзій, інтэрстылёвых украпін і інтэрлексем); павышанная ўвага да кантэксту (веданне перадумоў і пэўных прычын стварэння тэксту, інфармацыі пра аўтара і яго інтэнцый, іншымі словамі, тэкстуальнага дыскурса).

Прафесар Віктар Іўчанкаў дамінантнымі праявамі постмадэрнісцкай манеры пісьма, увогуле, у сучасным літаратурным працэсе і, у прыватнасці, у тэкставай дзейнасці журналіста, лічыць рэалістычную выяўленчасць і фантасмагарычнасць, мастацкасць і навуковасць, побытную апісальнасць і філасафічнасць, сур'ёзнасць і іранічнасць, традыцыйнасць і тэхналагічную сучаснасць, рацыяналістычнасць і містычнасць, вострую палітызаванасць і эратычнасць, строгую аналітычнасць і гульнёвы пачатак, сінкрэтызм пазіцый заходняй і ўсходняй культур [1, с. 137].

Газетныя і часопісныя артыкулы, тэлевізійныя і радыёперадачы сёння ўяўляюць сабой медыя-меніпею, якая будуецца як мазаіка цытацый, што здольна ўвабраць у сябе любыя жанры – навелы, лісты, аратарскія прамовы, змешаныя вершы і прозу [2, с. 19]. Існаванне такой усеагульнай пастыш-прасторы, у якой знаходзяцца ў сітуацыі постмадэрну і стваральнік, і ўспрымальнік інфармацыі, таксама можна інтэрпрэтаваць як своеасаблівую характарыстыку постмадэрнісцкай манеры пісьма. Спасылкі на гістарычны, папярэдні літаратурны кантэкст, апеляцыя аўтараў эпохі постсучаснасці да саміх сябе, аўтарскія самапаўторы (гэта датычыцца як мастацкай літаратуры, так і публіцыстыкі) успрымаюцца філосафамі, лінгвістамі, журналістамі і літаратуразнаўцамі як прыкметы крызісу, які напаткаў сучасны літаратурны працэс. Расійская даследчыца СМІ Свят-

лана Смятаніна адзначае, што “ў журналістыцы паўторы, пераходзячы з тэксту ў тэкст, становяцца натуральным для газетнай мовы будаўнічым матэрыялам (клішэ) і садзейнічаюць тыражаванню метада” [3, с. 91]. Падобнае выкарыстанне інтэртэкстуальных прыёмаў лічыцца спецыялістамі мовазнаўцамі ганебным.

Вялікая колькасць інтэртэкстуальных адзінак (цытат, рэмінісцэнцый, алюзій і іх відаў), а таксама прыём інтэрстылёвага таніравання даволі часта выкарыстоўваюцца сёння журналістамі. За кошт выкарыстання інтэртэкстуальных сродкаў аўтар спрабуе ўзбагаціць сэнсавую сруктуру ўласнага публіцыстычнага артыкула, пры гэтым, спасылаючыся на прэцэдэнтныя феномены (сітуацыі, тэксты і выказванні), ствральнік тэксту не толькі раскрывае сваю канцэптуалізацыю рэчаіснасці, светапогляднае стаўленне да падзеі, але і падштурхоўвае чытача да інтэлектуальнага развіцця.

На жаль, вельмі часта ў сучасным публіцыстычным дыскурсе можна сустрэць і няграматнае, неабгрунтаванае з рэдактарскага пункту гледжання выкарыстанне журналістам інтэртэксту, калі апошні зацяняе, ці нават цалкам перакрывае, сэнс інфармацыйнага паведамлення, у выніку чаго адбываецца разбурэнне камунікатыўных сувязяў паміж аўтарам і чытачом.

Постмадэрнісцкая манера пісьма – адбітак той эпохі, у якой яна ўзнікла і развіваецца. Гэта з’ява знаходзіцца зараз у сітуацыі заганнага кола: пакуль грамадства, непасрэдны атрымальнік інфармацыі будзе пагаджацца з такім станам рэчаў, да тае пары сродкі масавай інфармацыі будуць спараджаць і падтрымліваць яе, і наадварот, пакуль СМІ будуць прадуцыраваць і прэзентаваць менавіта такую інфармацыю, спажыўцы будуць яе прымаць.

Злоўжыване “чужым” словам, якое мы назіраем зараз у сучасным беларускім публіцыстычным дыскурсе, непазбежна прыводзіць да страты ствральнікам тэксту ўласнай асобы, да рэдукцыі яго індывідуальнасці альбо нават да “смерці аўтара”, аб чым папярэджваў яшчэ Ралан Барт у сваіх навуковых працах. Ва ўмовах паэтыкі постмадэрнізму, якая рэгламентуе сёння і тэкстабудаванне і тэкстаўспрыманне, гэта значыць і аўтарскую і чытацкую дзейнасць па стварэнні тэксту, вытворцу (донару) інфармацыі і яе спажыўцу (рэцыпіенту) трэба прыкласці ўсе намаганні, каб аб’яднацца для агульнай “барацьбы” за свае правы аўтарытарна канструяваць і суб’ектыўна інтэрпрэтаваць тэкст. Калі аўтар не будзе дакладна ацэньваць і суадносіць сродкі, якія ён выкарыстоўвае для перадачы інфармацыі, з ментальнымі ўласцівасцямі і магчымасцямі чытача, а апошні, у сваю чаргу, не будзе спрабаваць узняць свой інтэлектуальны ўзровень, то

навукоўцам прыйдзецца канстатаваць пасля “смерці аўтара” і “смерць чытача”, як раўнапраўнага ўдзельніка працэсу стварэння аб’ектыўнага (аўтарскага) і суб’ектыўнага (чытацкага) тэкстаў.

**Літаратура**

1. Іўчанкаў, В. І. Журналісцкі тэкст і постмадэрнісцкая манера пісьма // Журналістыка-2005. – Мн.: БДУ, 2005.

2. Кристева, Ю. Бахтин, слово, диалог и роман // Диалог. Карнавал. Хронотоп. – 1993. – № 4.

3. Сметанина, С. И. Медиа-текст в системе культуры (динамические процессы в языке и стиле журналистики конца XX века). – СПб.: Изд-во Михайлова В. А., 2002.